

# Emmaus

Бюлетэнь *рымска-каталіцкай парафіі Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі*
№ 3-2014, 23.02.2014
PDF–архіў на сайце **www.kasciol.by**

## Парафіяльныя абвесткі:

**VII Нядзеля Звычайнага Перыяду**.



На гэтым тыдні **расклад святых Імшаў** будзе наступны:

- ✓ у панядзелак, пятніцу – у 18.00
- ✓ у аўторак, сераду, суботу – у 10.00
- ✓ у чацвер святой Імшы ў капліцы <u>не будзе</u>
- ✓ у наступную нядзелю – у 10.00 і 16.00.

Сёння, 23 лютага, у Касцёле ў Беларусі перажываем дзень асаблівай малітвы за Украіну.

У нашай парафіі па нядзелях адбываюцца **катэхезы дарослых**, падчас якіх мы спрабуем разам разважаць над нашай духоўнасцю. Сёння паспрабуем распачаць разважанне над Літургіяй Слова.

Парафіяльная газета *Emmaus* – **штотыднёвы бюлетэнь** для супольнасці, у якім знойдзем м.інш. парафіяльныя абвесткі, разважанне над Божым Словам, і іншую карысную інфармацыю для духоўнасці.

Рыхтуемся да распачацця Вялікага Посту – **5 сакавіка – Папяльцовая Серада.**

**Просьба аб малітве** за тыя парафіі, якія не застаюцца абыякавымі адносна лёсу нашай супольнасці – Ракаўская парафія, парафія св. Сымона і Алены ў Мінску, а таксама парафія св. Яна Евангеліста і св. Максіміляна ў Мінску.

тэл: **8-029-880-99-19** (*кс. Андрэй*)

## Катэхізіс у пытаннях і адказах:

**ПРА БОЖЫЯ ЗАПАВЕДЗІ (ч.ІІ)**



**1. Як гучыць чацвёртая запаведзь?**

- Шануй бацьку свайго і маці сваю.

**2. Калі мы выконваем чацвёртую запаведзь?**

- Мы выконваем чацвёртую запаведзь, калі любім і шануем сваіх бацькоў, слухаемся іх і дапамагаем ім, а таксама калі з пашанаю адносімся да настаўнікаў, выхавацеляў і старэйшых, калі любім і молімся за сваю Айчыну.

**3. Як гучыць пятая запаведзь?**

- Не забівай.

**4. Калі мы выконваем пятую запаведзь?**

- Мы выконваем пятую запаведзь, калі клапоцімся пра жыццё і здароўе сваё і бліжніх: выконваем правілы дарожнага руху, не курым і не ўжываем алкагольных напояў, не б'ёмся, апранаемся адпаведна надвор'ю, не крыўдзім бліжніх, а таксама калі беражліва адносімся да прыроды.

**5. Як гучаць шостая і дзевятая запаведзі?**

- Шостая: не чужалож.
- Дзевятая: не пажадай жонкі бліжняга твайго.

**6. Калі мы выконваем шостую і дзевятую запаведзі?**

- Шостую і дзевятую запаведзі мы выконваем, калі захоўваем сціпласць і сарамлівасць у думках, словах, адзенні, учынках, калі пазбягаем бессаромных паводзінаў, сяброўстваў, фільмаў і фотаздымкаў

Крыніца: http://katecheta-by.narod.ru/index/0-2.

## Хрысціянскі гумар:



**У матацыкліста-экстрэмала было некалькі няўдалых падзенняў. Практычна не засталося ні адной косткі, якая не падвяргалася б пераломy. Не адзін раз знаходзіўся паміж жыццём і смерцю, але працягвае займацца любімай справай. І вось як гэта аргументуе: - Мне гэта падабаецца, і я гэтым займаюся. Я думаю, што, калі б мне не трэба было гэтым займацца, Бог даў бы мне ЗНАК.**

(Паводле: www.katolik-gomel.by)

## Падзеі з жыцця Касцёла:



**15-16 лютага** моладзь Маладзечна наведала магілёўскі катэдральны касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і св. Станіслава і некаторыя месцы Магілёўшчыны

**19 лютага** Папа Францішак заклікаў да мірнага заканчэння канфлікту ва Украіне.

**20 лютага** адбылося пастырскае спатканне духавенства нашай архідыяцэзіі

**21 лютага** адзначаўся міжнародны дзень роднай мовы

**21 лютага** адбылося пасяджэнне Канферэнцыі Біскупаў Беларусі.

## Нядзельнае Евангелле:

Мц 5, 38–48

*Любіце ворагаў вашых*



**У той час Езус сказаў сваім вучням: Вы чулі, што сказана: вока за вока і зуб за зуб. А Я вам кажу не праціўіцца злому. Калі хто ўдарыць цябе па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую. І калі хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе кашулю, аддай яму і плашч. І калі хто цябе змусіць ісці з ім адну мілю, ідзі з ім дзве. Таму, хто просіць у цябе, дай і не адварочвайся ад таго, хто хоча пазычыць у цябе.**

**Вы чулі, што сказана: Любі бліжняга свайго і ненавідзь ворага свайго. А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых і маліцеся за тых, хто пераследуе вас, каб сталіся вы сынамі Айца вашага, які ў нябёсах. Бо Ён загадвае сонцу свайму ўзыходзіць над дрэннымі і добрымі і пасылае дождж на справядлівых і несправядлівых.**

**Бо, калі вы будзеце любіць тых, хто любіць вас, якую маеце ўзнагароду? Ці ж не тое самае робяць і мытнікі? І калі вітаеце толькі братоў вашых, што асаблівага робіце? Ці ж не тое самае робяць і язычнікі? Таму будзьце дасканалымі, як дасканалы Айцец ваш Нябесны.**

*У сённяшнім Евангеллі мы чуем заклік да дасканаласці, да жыцця паводле сапраўднай любові, якая з'яўляецца дарам асобы для асобы.*

*Хрыстос не толькі заклікае да таго, каб мы любілі адзін аднаго – Ён раказвае нам, як гэта трэба рабіць, асабліва тады, калі ў нашым грамадзтве валадарыць несправядлівасць, зло, нянавісць…*

Роздум:

# Ці спісванне – грэх?



Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба ўспомніць азначэнне граху: грэх - гэта дабравольнае і свядомае парушэнне запаведзяў Божых альбо касцёльных.

Што адбываецца падчас спісвання? Асоба, якая карыстаецца гэтым “метадам”, хоча як мага лепшы вынік атрымаць за найменшую працу(калі гэта можна назваць працай).

Як бы мы не хацелі апраўдаць спісвання, яно з’яўляецца адным з відаў хлусні. Бо я, калі спісваю, раблю выгляд, што праца, якую я не выканаў, з’яўляецца маім “творам”( ці маю веды, якіх на самрэч не маю).

Адна з Божых запаведзей гучыць наступным чынам: Не сведчы фальшыва супраць бліжняга свайго. Іншымі словамі, не кажы хлусні – адносна сябе і іншых людзей, кажы праўду. Менавіта як хлусня – парушэнне Божай запаведзі – спісванне з’яўляецца грахом.

Іншай справай з’яўляецца ранга гэтай правіны. Трэба задаць сабе пытанне: А чаму, навошта я спісваю?( Ці даю спісваць?)

“Бо не змог навучыцца!” – вельмі часта гучыць такі адказ… А чаму не змог? Сучасны чалавек хоча усё мець тут і цяпер, без працы і цяжару. І ў пераважнай большасці мы не можам навучыцца прадмету, бо … лайдачым. Лянота, усеагульная млявасць і абыякавасць – вось прычына ненавучэння многіх з нас. Немагчыма шукаць апраўдання для таго, хто, замест вучобы, знаходзіў час толькі на нейкія-там гульні, а пасля знаходзіць спісванне як дошку ратунку, як панацэю на ўсе свае “хваробы”.

Іншая справа, калі я сапраўды маю аб’ектыўныя прычыны ў адносіне да таго, што не змог зрабіць даручанай працы( хвароба, поўная адсутнасць здольнасці іг.д.)… У такім выпадку варта папрасіць сваіх сяброў, каб яны дапамаглі, растлумачылі незразумелыя моманты, але гэта не азначае, што трэба проста перапісаць штосьці з чужога сшытка ў свой!

Мы павінны дапамагаць адзін аднаму станавіцца лепшымі, станавіцца людзьмі ў поўні гэтага слова. Спісванне закрывае нам шлях для развіцця, бо “жыццё на-халяву”, да якога яно па-сутнасці прыводзіць, вядзе да дэградацыі чалавека. Ці сапраўды яно абавязкова павінна прысутнічаць у нашым жыцці?

Крыніца: www.vilejka.by

2014 © **Рымска-каталіцкая парафія Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі**